Слова для Жыцця (166)

Аўтар: Рэдакцыя
24.06.2018 00:00



Папа Францішак

Я хацеў бы сказаць асабліва моладзі, што наш самы небяспечны вораг – гэта не канкрэтныя праблемы, якімі б сур'ёзнымі і драматычнымі яны не былі; самая вялікая небяспека ў жыцці – гэта злы дух прыстасавальніцтва, які не з'яўляецца ні лагоднасцю, ні пакорай, але павярхоўнасцю і маладушнасцю.

Калі маці і бацька бачаць юнака, які пасіўна сядзіць увесь дзень дома, што думаюць пра яго: "Ці не хворы ён?", – і вядуць яго да ўрача... Ці не так? Жыццё маладога чалавека – гэта імкненне наперад, заклапочанасць, здаровы неспакой, здольнасць не згаджацца на жыццё без прыгажосці, без колеру. Калі маладыя людзі не будуць прагнуць сапраўднага жыцця, куды прыйдзе чалавецтва? Куды прыйдзе чалавецтва з пасіўнай, пазбаўленай неспакою моладдзю?

Малады чалавек павінен дайсці да парога пэўнага пераходу, дзе адкрываецца магчымасць перастаць жыць самім сабой, сваімі справамі, сваімі дабротамі, і менавіта таму, што яму не хапае поўнага жыцця – пакінуць усё, каб пайсці за Панам... Езус жа прапануе не сурагаты, а сапраўднае жыццё, сапраўдную любоў, сапраўднае багацце! А як зможа моладзь ісці за намі ў веры, калі не будзе бачыць, што выбіраем "арыгінал", калі бачаць нас, прызвычаеных да паўмер. Кепска, калі сустракаеш хрысціян напалову, хрысціян – дазволю сабе сказаць – "карлікавых", якія растуць толькі да пэўнай вышыні, а потым ужо не, хрысціян з абмежаваным, закрытым сэрцам. Кепска, калі сустракаеш такое. Патрэбны прыклад кагосьці, хто пакліча мяне выйсці "па-за", "далей", каб пакрысе ўзрастаць…

Фрагменты прамовы падчас агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане, 13.06.2018 †

Слова для Жыцця (166)

Аўтар: Рэдакцыя
24.06.2018 00:00

